**Выканайце заданні алімпіяднага практыкуму**

**1.** Дзе прадмет (1), дзе страва (2), а дзе адначасова страва і прадмет (3)?

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Фаска | Каснік | Конаўка | Цырата | Шпіг | Аброць |
| Цітаўка | Фіранка | Цыноўка | Чарэнь | Кульба | Студзень |
| Цукора | Керагаз | Флёр | Мачанка | Цеціва | Юшка |
| Хрушчы | Кібітка | Студня | Фрыкасэ | Лубок | Карункі |
| Карэйка | Кіндзюк | Кошка | Кужаль | Манты | Чапяла |
| Карэц | Козлы | Крушон | Бабка | Капытка | Мачанка |

*Адказы*

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Фаска – 1 | Каснік – 1 | Конаўка – 1 | Цырата – 1 | Шпіг – 2 | Аброць – 1 |
| Цітаўка – 2 | Фіранка – 1 | Цыноўка – 1 | Чарэнь – 1 | Кульба – 1 | Студзень –2 |
| Цукора – 2 | Керагаз – 1 | Флёр – 1 | Мачанка – 2 | Цеціва – 1 | Юшка – 3 |
| Хрушчы – 2 | Кібітка – 1 | Студня – 1 | Фрыкасэ – 2 | Лубок – 1 | Карункі – 1 |
| Карэйка – 2 | Кіндзюк – 2 | Кошка – 1 | Кужаль – 1 | Манты – 2 | Чапяла – 1 |
| Карэц – 1 | Козлы – 1 | Крушон – 2 | Бабака – 3 | Капытка – 2 | Мачала – 1 |

**2.** Падпішыце назвы прадметаў (падказка: яны ўжываюцца ў першым заданні):







1 2 3 4 5







6 7 8 9 10

*Адказы*. 1. Кульба. 2. Цыноўка. 3. Карэц. 4. Студня. 5. Козлы. 6. Керагаз. 7. Карункі. 8. Лубок. 9. Чапяла. 10. Конаўка.

**3.** Устаўце словы* *мова, бацька, дар* у фразеалагізмы і прыказкі.

| Фразеалагізм | Слова, якое неабходна падставіць |
|---|---|
| Агульная… | *мова* |
| Шануй … з маткай – другіх не знойдзеш | *бацьку* |
| Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю … – усё згубіў | *мову* |
| Лезці раней за … у пекла | *бацьку* |
| Хто … шануе, той сабе неба гатуе | *бацьку* |
| … у салдатах, а кашуля ў латах | *бацька* |
| Дар за … | *дар* |
| Разумны … і ў сына пытае | *бацька* |
| Божы … з яешняй | *дар* |
| …данайцаў | *дары* |
| Эзопава… | *мова* |

| | |
|---|---|
| Калі … не навучыў, то людзі навучаць | *бацька* |
| Усяму пачатак – родная… | *мова* |
| Хросны … | *бацька* |
| На розных … | *мовах* |
| … слова | *дар* |

* У табліцах заданняў 3–6, 13, 17 адразу змешчаны адказы на заданне (курсіў).

**4.** Адкажыце на пытанні віктарыны.

| Пытанне | Адказ |
|---|---|
| Калі ў беларусаў адбываецца свята, звязанае з падкрэсленым у песні вечарам: добры вечар, <u>шчодры</u> <u>вечар</u> // Усім людзям на ўвесь вечар | *31 снежня (13 студзеня)* |
| Калі спяваюць валачобныя песні? | *На Вялікдзень* |
| Які жанр гэтай песні: на граннай нядзелі русалкі сядзелі? | *Русальная* |
| З якім святам звязаны абрад “завівання барады”? | *Дажынкі* |
| Калі адбываецца падзея ў падкрэсленым слове прыказкі: “Разгуляліся, як ваўкі на <u>Піліпаўку</u>”? | *На калядны пост, з 28 лістапада па 6 студзеня* |
| Калі нашы продкі спявалі такія радкі: Талака талачылася, // Увесь дзень па полі валачылася? | *Падчас калектыўнага звычаю – талакі* |
| Пра якую бабульку гаворыцца ў радках песні: “Любыя госці, любыя госці! // Бабуля на куце сядзіць, // Харошую песню пяе”? | *Бабка-павітуха – жанчына, якая дапамагала нарадзіцца дзіцяці* |
| Як у беларускіх народных песнях называюць героя, які спявае на ноч дзецям? | *Бай* |
| Як называецца жанр песень, якія спяваюць на провады ў армію? | *Рэкруцкія* |
| Якая падзея ў земляробчым календары беларуса пачыналася з песні: “Дай, Бог, каб парасло // На ўсякую долю”? | *Зажынкі* |
| Падчас якой рытуальнай трапезы беларусы гаварылі: “Святыя радзіцелі! // Хадзіце к нам хлеб-соль есці”? | *Радаўніца* |
| На якое свята ў поле выганялі кароўку і гаварылі: “З Богам, кароўка, на пашу! // Будзь здарова цэлы год, // Як зямля і лёд”? | *На Юр’е (6 мая)* |
| Якое слова неабходна ўставіць у радок песні: “Божа наш! … ночка невялічка”? | *Пятрова* |

**5.** Запішыце масць каня па апісанні.

| Апісанне | Назва масці |
|---|---|
| Чорны | *Вараны* |
| Рыжа-карычневы | *Гняды* |
| У плямы | *У яблыкі* |
| Чырвона-жоўты | *Рыжы* |
| Колеру попелу | *Шэры* |
| Жаўтавата-пясочны | *Буланы* |
| У белыя плямы | *Пегі* |

| | |
|---|---|
| Залацісты з белым | *Саловы* |

**6.** Пра якія дары прыроды гаворыцца ў кожнай групе?

| № | Група | Адказ |
|---|---|---|
| 1 | <u>Прыказка:</u> … сярод садавіны, што бульба сярод гародніны<br><u>Фразеалагізм:</u> Адамаў …<br><u>Верш:</u> Бурштынавыя … у расе, – // Гэта ты, мая Беларусь! (П.Панчанка)<br><u>Назва твора:</u> “Салодкія …” (В.Адамчык) | *Яблык* |
| 2 | <u>Прыказка:</u> Прыказка ў размове, як салодкі … у чыгуне<br><u>Фразеалагізм:</u> як … намазана<br><u>Верш:</u> Дзе хапае да хлеба і солі // і на сталах не канчаецца … (Я.Янішчыц)<br><u>Назва твора:</u> “Горкі ліпавы …” (А.Васілевіч) | *Мёд* |
| 3 | <u>Прыказка:</u> Бог за глінай, як я за …<br><u>Фразеалагізм:</u> … мост<br><u>Верш:</u> Песняй вясны лебядзінаю, // Скінуўшы зімнія чары, // Шэпчуцца явар з … (Я.Купала)<br><u>Назва твора:</u> “… зімы” (Я.Янішчыц) | *Каліна* |
| 4 | <u>Прыказка:</u> Смачны жабе …, але Бог зубоў не даў.<br><u>Фразеалагізм:</u> зарабіць на …<br><u>Верш:</u> Вось і выспелі …// – Дачакаліся пары: // Цэлы дзень у гушчары // Чутны крыкі дзетвары (Н.Гілевіч)<br><u>Назва твора:</u> “У …” (Р.Ігнаценка) | *Арэх* |
| 5 | <u>Прыказка:</u> Жаночая доля – што … у полі.<br><u>Фразеалагізм:</u> … ноч<br><u>Твор:</u> Як тая …, цвіла ў гэтае лета Ганна (І.Мележ)<br><u>Назва твора:</u> “…” (А.Федарэнка) | *Рабіна* |

**7.** Размяжуйце, дзе прадмет для пераносу рэчаў і багажу (1), а дзе галаўны ўбор (2):

| | | | |
|---|---|---|---|
| Кайстра | Скіндачка | Хатуль | Ягдташ |
| Аблавуха | Валізка | Чапец | Кош |
| Баул | Скуф’я | Торба | Каптур |
| Саквояж | Клунак | Капялюш | Уюк |
| Магерка | Мяшок | Кучма | Брыль |

*Адказы*

| | | | |
|---|---|---|---|
| Кайстра – 1 | Скіндачка – 2 | Хатуль – 1 | Ягдташ – 1 |
| Аблавуха – 2 | Валізка – 1 | Чапец –2 | Кош – 1 |
| Баул – 1 | Скуф’я – 2 | Торба – 1 | Каптур – 2 |
| Саквояж – 1 | Клунак – 1 | Капялюш – 2 | Уюк – 1 |
| Магерка – 1 | Мяшок – 1 | Кучма – 2 | Брыль – 1 |

**8.** Разгледзьце малюнкі і падпішыце прадметы, якія вы на іх бачыце.

| | | | |
|---|---|---|---|
|  Малюнак 1 |  Малюнак 2 |  Малюнак 3 |  Малюнак 4 |
|  Малюнак 5 |  Малюнак 6 |  Малюнак 7 |  Малюнак 8 |
|  Малюнак 9 |  Малюнак 10 |  Малюнак 11 |  Малюнак 12 |

*Адказы*. Малюнак 1 – цукарніца, малюнак 2 – хрушч, малюнак 3 – валок, малюнак 4 – аканіцы, малюнак 5 – ліхтарык, малюнак 6 – весніцы, малюнак 7 – гарбузікі, малюнак 8 – дзічка, малюнак 9 – лузанцы, малюнак 10 – азярод, малюнак 11 – люлька, малюнак 12 – шаткоўня.

**9.** Словазлучэнні на рускай мове перакладзіце на беларускую мову адным словам і ўстаўце ў прыказкі.

| | |
|---|---|
| 1. Проводить время на балу. | А. Лепей …, чым красці. |
| 2. Собирать милостыню, просить подаяния. | Б. З дужым не …, з багатым не судзіся. |
| 3. Идти напрямик, не сворачивая. | В. Хто …, той чубіцца. |
| 4. Мериться силами. | Г. Блізка відаць, ды далёка … . |
| 5. Любить друг друга. | Д. Змоладу …, а пад старасць жабравалі. |
| 6. Идти размеренно и важно; идти неуклюже. | Е. Дзень з алеем, а тры дні … . |
| 7. Становиться голым; выглядеть пустым, голым. | Ё. Хто …, той дома не начуе. |

*Адказы*. 1 – Д (баляваць). 2 – А (жабраваць). 3 – Ё (праставаць). 4 – Б (дужацца). 5 – В (любіцца). 6 – Г (дыбаць). 7 – Е (галець).

**10.** У якіх з прыведзеных слоў правільна вызначана лексічнае значэнне?

| Слова | Лексічнае значэнне |
|---|---|
| Сярпянка | Ручка сярпа |
| Лямец | Войлак |
| Саматужнік | Рамеснік |
| Хохлік | Чорцік |
| Шаршатка | Мехавая шапка |
| Дратва | Зялёная трава |
| Пячурка | Запечанае мяса |
| Цвыркун | Дудачка |
| Крэйка | Дошка пад страхой |

| | |
|---|---|
| Крысо | Кажан |
| Газоўка | Газіраваная вада |
| Бэлька | Аконная рама |
| Супоня | Рэмень для сцягвання клешчаў хамута |
| Жывіца | Лекі |
| Аблога | Цаліна, неапрацаваная зямля |
| Імшара | Мох |
| Макотра | Посуд для расцірання маку |
| Папяроўка | Цукерка ў паперцы |
| Вячорка | Звычай збірацца ў вясковай хаце |

*Адказы*

| Слова | Лексічнае значэнне |
|---|---|
| Сярпянка | *Лёгкая бавоўняная тканіна* |
| Лямец | Войлак + |
| Саматужнік | Рамеснік + |
| Хохлік | Чорцік + |
| Шаршатка | *Доўгая і тоўстая іголка* |
| Дратва | *Тоўстая нітка для шыцця абутку* |
| Пячурка | *Ніша ў печы* |
| Цвыркун | *Насякомае* |
| Крэйка | *Дошка пад страхой +* |
| Крысо | *Ніжняя частка адзення* |
| Газоўка | *Газавая лямпа* |
| Бэлька | *Драўляны брус у сцяне хаты* |
| Супоня | Рэмень для сцягвання клешчаў хамута + |
| Жывіца | *Смала дрэў* |
| Аблога | Цаліна, неапрацаваная зямля + |
| Імшара | *Балота* |
| Макотра | Посуд для расцірання маку + |
| Папяроўка | *Сорт яблыкаў белага колеру* |
| Вячорка | *Вячэрняя газета* |

**11.** Складзіце прыказкі з назвамі беларускага нацыянальнага адзення.

**У**  **лазня не мыцца**

Малюнак 1

**зраўняць**  **з** 

Малюнак 2

**вяселле**  **і знайсці**

Малюнак 3

**пазнаць і**  **ў дачка наша**

 **каму Мікіта знаць пашыць**

**іншы**  **не варты** 

Малюнак 4 Малюнак 5 Малюнак 6




Малюнак 7




Малюнак 8




Малюнак 9

*Адказы.* Малюнак 1 – У кажусе ў лазні не мыюцца. Малюнак 2 – Зраўняў бот з лапцем. Малюнак 3 – Вяселле і кашулю знойдзе. Малюнак 4 – Пазнаюць нашу дачку і ў андарачку. Малюнак 5 – Знае Мікіта, каму каптан пашыты. Малюнак 6 – Іншы жупан не варты сярмягі. Малюнак 7 – Капелюшом галавы не ўпрыгожыш. Малюнак 8 – Кожны Яромка знойдзе сабе шапку. Малюнак 9 – Паны – па трое ў штаны.

**12.** Падкрэсліце словы, якія адпавядаюць назвам беларускіх народных танцаў: лапці, кола, маладзік, крыжачок, мяцеліца, знічка, верабей, каза, бурачок, дзятлік, лянок, таўкачыкі, апалушка, лісіца, рэпка, ланцуг, абцугі.

*Адказы.* “Кола”, “Крыжачок”, “Мяцеліца”, “Верабей”, “Каза”, “Лянок”, “Таўкачыкі”, “Рэпка”, “Ланцуг”.

**13.** Адгадайце, да якой групы адносяцца прадметы і з’явы.

| Прадметы і з’явы | Група |
|---|---|
| Набожнік, скарач, надзежнік, намітка, уціральнік, платкі | *Назвы ручніка* |
| Панёва, андарак, даматкан, саян, бурка | *Назвы спадніцы* |
| Флёр, байка, аксаміт, драп, бавоўна, фланель, сацін | *Назвы тканіны* |
| Праснак, скавароднік, калач | *Назвы хлеба* |
| Жужаль, плывунец, цвыркун, конік, багоўка | *Назвы насякомых* |
| Бэра, сапяжанка, дзюшэс, лімонка | *Гатункі груш* |
| Смуга, бліскавіца, золак, залева, слота, золь, абліваха | *З’явы прыроды* |
| Ходзікі, будзільнік, загарак | *Віды гадзіннікаў* |

**14.** Адгадайце народныя назвы скарбаў лесу, лугу, возера, балота (падказкі на малюнках).

1. Вожыкава ягада________
2. Кветка “заячыя вушы”________

3. Ягада жураўлёў________
4.  Расліна “кашка”_______
5. Расліна “заячая кроў”___________
6. Расліна “салдацкая трава”________
7. Кветка “свіная рэпа” ____________
8. Расліна “бабін цвет” ____________
9. Кветка “мядзведжая лапка”_______
10. Расліна “сабачнік”__________
11. Расліна “камчужная трава”_________
12. Кветка “раннік”, “валошка”_______



*Адказы*. 1   Ажыны.  2. Ландыш.  3.  Журавіны.
3. Канюшына.      5. Зверабой.      6. Крываўнік.
7. Мальва.           8. Трыпутнік.           9. Лотаць.
10. Дзядоўнік. 11. Падбел. 12. Васілёк.

**15.** Адгадайце асабовыя назоўнікі.

1. У перакладзе з грэчаскай мовы гэта той, хто паўтарае. *(Рэпетытар)*
2. У даслоўным перакладзе з французскай мовы гэта “*даследчык”*. Падказка: сябар дзіцячай арганізацыі. *(Піянер)*
3. У даслоўным перакладзе з грэчаскай мовы гэта “*зямляк, суайчыннік”*. Падказка: той, хто любіць сваю Радзіму. *(Патрыёт)*
4. З лацінскай мовы гэта слова перакладаецца як “*настаўнік”*. Падказка: вышэйшае вучонае званне выкладчыка вышэйшых навучальных устаноў. *(Прафесар)*
5. Чалавек, які мае аднолькавае з кім-небудзь імя. *(Цёзка)*
6. Ураджэнец адной з кім-небудзь мясцовасці. *(Зямляк)*
7. Чалавек, які мае з кім-небудзь агульную Айчыну. *(Суайчыннік)*
8. Пісьменнік, які піша прозай, стварае празаічныя творы. *(Празаік)*

**16.** Адгадайце, пра што ў народзе так кажуць.

1. Беларускі кіпарыс _________
2. Беларуская пальма _________
3. Беларускае мора ___________
4. Беларускі Крылоў __________
5. Беларускі шоўк ____________
6. Беларускі апельсін _________

*Адказы*. 1. Ядловец. 2. Бяроза. 3. Возера Нарач. 4. Кандрат Крапіва. 5. Лён. 6. Рэвень.

**17.** Адгадайце словы па значэнні.

| Лексічнае значэнне | Адказ |
|---|---|
| Невысокі земляны насып вакол хаты | *Прызба* |
| Старажытная мера даўжыні, роўная прыблізна 2 м 13 см | *Сажань* |
| Нізкі заліўны луг каля ракі | *Балонне* |

| | |
|---|---|
| Даўгаполая з шырокімі рукавамі вопратка селяніна з саматканага сукна | *Бурнос* |
| Старая мера лічэння – 60 штук | *Капа* |
| Ніжняя патоўшчаная частка дрэва, расліны, якая прылягае да кораня | *Камель* |
| Трава, якая вырасла ў той жа год на месцы скошанай | *Атава* |
| Сіняя фарба, якая выкарыстоўваецца для падсіньвання бялізны, паперы | *Сінька* |
| Павук з крыжападобным рысункам са светлымі плямамі на спіне | *Крыжавік* |
| Нявораная зямля, густа паросла травой | *Дзірван* |
| Ажурны ўзор, выразаны з белай, чорнай ці каляровай паперы | *Выцінанка* |

**18.** Адгадайце словы, якія заканчваюцца на –дар.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | д | а | р |
| 2. | | | | | д | а | р |
| | | 3. | | | д | а | р |
| | | 4. | | | д | а | р |
| | | | 5. | | д | а | р |
| | | | 6. | | д | а | р |

1. Галава сям’і, дома.
2. Раздатчык хлеба, напрыклад, у манастырах.
3. Майстар па вырабе драўлянага посуду.
4. Форма афіцыйнага ветлівага звароту да асобы ў беларусаў.
5. Музыкант, які іграе на дудзе.
6. Кіраўнік групы.

*Адказы. 1. Гаспадар. 2. Хлебадар. 3. Бондар. 4. Спадар. 5. Дудар. 6. Лідар.*